УДК 94:379.81“18/19”(476)

# ЭКСКУРСІІ-ПАЛОМНІЦТВЫ Ў ВІЛЕНСКАЙ НАВУЧАЛЬНАЙ АКРУЗЕ Ў ПАЧАТКУ ХХ СТ.

*Зянько А. Л.*
Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі
Мінск, Беларусь

***Анатацыя.*** *У артыкуле закранута тэма развіцця рэлігійнага турызму ў навучальных установах Віленскай навучальнай акругі.*

***Ключавыя словы:*** *рэлігійны турызм; паломніцтва; экскурсіі; навучэнцы; Віленская навучальная акруга.*

# PILGRIMAGE EXCURSIONS IN THE VILNIUS EDUCATIONAL DISTRICT AT THE BEGINNING OF THE XX CENTURY

*Zianko A. L.*
National Historical Archives of Belarus
Minsk, Belarus

***Annotation.*** *The article touches upon the topic of development of religious tourism in educational institutions of the Vilnius educational district.*

***Keywords:*** *religious tourism; pilgrimage; excursions; students; Vilnius educational district.*

У пачатку ХХ ст. паняцці «паломніцтва» і «рэлігійны турызм» не раздзяляліся і ўсе паездкі і падарожжы, звязаныя з наведваннем рэлігійных аб’ектаў, называліся паломніцтвамі. Нягледзячы на наяўнасць шэрага агульных рыс, у першую чаргу яны адрозніваюцца мэтамі, якія пакладзены ў аснову падарожжа, і ўнутраным зместам. «Паломніцтва – гэта частка рэлігійнага жыцця веруючага чалавека, гэта значыць не проста наведванне святыняў, але форма рэлігійнай практыкі, якая ўключае ўдзел у богаслужэнні, працэсіях (хросны ход), духоўныя гутаркі, розныя аскетычныя практыкі, працоўную і іншую дабрачынную дзейнасць на карысць рэлігійнай арганізацыі» [1, с. 14]. У той час як рэлігійны турызм прадугледжвае наведванне святых месцаў з пазнавальнымі мэтамі [2, с. 23], аб’ектамі рэлігійнага турызму выступаюць храмы, манастыры, рэлігійныя прадметы, населеныя пункты і іх асобныя часткі, археалагічныя помнікі і інш. У дадзенай рабоце ўвага будзе накіравана на развіццё рэлігійнага турызму ў навучальных установах Віленскай навучальнай акругі ў пачатку ХХ ст.



№ 398

25

28 Августа

М.Н.П.
Попечителя
Виленскаго учебнаго
округа.
Канцелярія.
Столъ 4.
Августа 17 дня 1910г.
№ 15841.

Копія. Циркулярно / 208 /.

Г.г.Начальникамъ среднихъ учебныхъ заведеній и директорамъ учительскихъ институтовъ и семинарій Виленскаго учебнаго округа.

Изъ поступающихъ въ Управленіе учебнаго округа отчетовъ о совершенныхъ минувшимъ лѣтомъ ученическихъ экскурсіяхъ мною усмотрѣно, что въ Слуцкой мужской гимназіи была организована въ іюлѣ мѣсяцѣ экскурсія изъ 50 человѣкъ воспитанниковъ, въ сопровожденіи 7 лицъ педагогическаго персонала, подъ руководствомъ о.законоучителя гимназіи Генн.Захаревича, въ Слуцкій Св. Троицкій монастырь, гдѣ экскурсанты были ознакомлены руководителемъ экскурсіи съ исторіей монастыря въ связи съ исторіей г.Слуцка и затѣмъ, съ разрѣшенія и при любезномъ содѣйствіи монастырскаго начальства, осмотрѣли находящіяся въ монастырѣ святыни и многіе древніе предметы, имѣющіе непосредственное отношеніе къ богатому историческими событіями прошлому монастыря. Таковая экскурсія не могла не вызвать въ ученикахъ подъема религіознаго чувства и живого историческаго интереса къ окружающему.

Въ предѣлахъ Виленскаго учебн.округа имѣется не мало церквей и монастырей, посѣщеніе которыхъ представляетъ громадный интересъ и можетъ принести пользу какъ въ воспитательномъ, такъ и въ образовательномъ отношеніяхъ. Считая совершеніе подобныхъ экскурсій весьма полезнымъ и необходимымъ, я нахожу чрезвычайно желательнымъ, чтобы и другія учебн.заведенія устраивали по возможности такія экскурсіи, подъ непосредственнымъ руководствомъ о.о.законоучителей.

Сообщая объ изложенномъ, прошу г.г.Начальниковъ учебныхъ заведеній пригласить о.о.законоучителей къ совершенію съ учащимися экскурсій, подобныхъ вышеуказанной. Подлинное подписалъ Попечитель Г.Левицкій, скрѣпилъ Правитель Канцеляріи С.Никоновъ.

Съ подлиннымъ вѣрно: За Столоначальника

*Малюнак 1.* **Цыркуляр № 15841 папячыцеля Віленскай навучальнай акругі аб неабходнасці наведвання праваслаўных святынь падчас экскурсій. 1910 г.**
***Крыніца:* НГАБ. – Ф. 2566. Воп. 1. Спр. 624. Арк. 25.**

Значная інфармацыя па гэтым пытанні змешчана ў складзеным А. І. Шастовым «Апісанні экскурсій навучэнцаў Віленскай навучальнай акругі за 1910 год». Сярод школьных экскурсій аўтар асобна выдзеліў паломніцтвы, да якіх ён адносіць усе наведванні навучэнцамі рэлігійных аб'ектаў. Па дадзеных А. І. Шастова, за 1910 г. выхаванцы 16 навучальных устаноў Віленскай навучальнай акругі здзейснілі 19 такіх экскурсій [3]. Аднак іх апісанне не поўнасцю адпавядае вызначэнню паломніцтва, бо такія паездкі адбываліся ў першую чаргу не як духоўная патрэба, выкліканая непасрэдна ўнутраным імпульсам і рэлігійным запатрабаваннем, а як ініцыятыва з боку навучальнай установы, праваслаўнай царквы і органаў кіравання адукацыяй. А. Л. Ільін называе азначаныя экскурсіі «гісторыка-духоўнымі (паломніцкімі)» і выдзяляе іх як адзін з найбольш распаўсюджаных відаў экскурсій сярод навучэнцаў дарэвалюцыйнага Пінска [4. с. 48]. У дадзенай рабоце такія экскурсіі будуць абазначацца як экскурсіі-паломніцтвы, якія мелі нараўне з рэлігійнымі выхаваўчыя і пазнавальныя мэты. На гэту форму работы з навучэнцамі звярнула ўвагу кіраўніцтва адукацыяй. Так, 17 жніўня 1910 г. папячыцель Віленскай навучальнай акругі ў сваім распараджэнні ўказаў: «Лічачы ажыццяўленне падобных экскурсій даволі карысным і неабходным. я знаходжу надзвычай пажаданым, каб навучальныя ўстановы ладзілі па магчымасці такія экскурсіі пад непасрэдным кіраўніцтвам законанастаўнікаў» [3, с. 194]. Законанастаўнікі (выкладчыкі Закона Божага) праводзілі «папярэднюю маральную падрыхтоўку» экскурсантаў. Католікаў, іўдзеяў і мусульман у экскурсіі-паломніцтвы браць не рэкамендавалася.

Экскурсіі-паломніцтвы, як правіла, фінансаваліся бацькамі, беднейшым вучням аказвалася матэрыяльная дапамога з боку апякунскіх саветаў навучальнай установы. Выдаткі на такія мерапрыемствы былі мінімальнымі (1 руб. – 1 руб. 50 кап.), таму што наведваліся ў асноўным мясцовыя святыні, а размяшчэнне і харчаванне ажыццяўлялася за кошт прымаючага боку. Напрыклад, для вучняў пачатковага вучылішча пры Рагачоўскай настаўніцкай семінарыі 8–9 мая 1911 г. была праведзена «рэлігійна-адукацыйная экскурсія пад кіраўніцтвам законанастаўніка, святара А. Бонч-Багданоўскага ў Баркулабаўскі жаночы манастыр». Згодна з ільготным тарыфам № 6900, ад станцыі Рагачоў да станцыі Быхаў 66 вучняў праехалі бясплатна. У Быхаве групу сустрэла настаўніца жаночага прыхадскога вучылішча, якая паказала экскурсантам горад і старажытны замак, а ў вучылішчы іх бясплатна напаілі гарба-

тай. Вечарам навучэнцы прыйшлі ў манастыр, дзе атрымалі вячэру і начлег. 9 мая экскурсанты прынялі ўдзел у храмавым свяце, паабедалі разам з паломнікамі, а вечарам вярнуліся дамоў. Такім чынам, навучэнцы не панеслі матэрыяльных затрат [5]. Некаторыя экскурсіі мелі даволі вялікі размах. Так, 12 верасня 1910 г. Яблычанскі мужчынскі манастыр у Седлецкай губерні наведалі 105 вучаніц Брэсцкай жаночай гімназіі ў суправаджэнні законанастаўніка, сямі класных дам, двух выкладчыкаў, трох чалавек прыслугі і сямі прадстаўнікоў бацькоўскага камітэта. Для ажыццяўлення падарожжа кіраўніцтва мясцовай чыгункі выдзеліла чатыры асобныя вагоны [6]. Экскурсійная дзейнасць ахапіла не толькі свецкія, але і духоўныя навучальныя ўстановы. Яшчэ ў 1908 г. Свяцейшы Сінод прызнаў «карысным наладжванне ў духоўна-вучэбных установах чытанняў і гутарак з нагоды вялікіх гістарычных гадавін і арганізацыю паломніцтваў і экскурсій навучэнцаў дзеля агляду родных святынь і помнікаў мінуўшчыны» [7, арк. 5–5 адв.].

Пэўная колькасць экскурсій-паломніцтваў з беларускіх губерняў накіроўвалася ў Пецярбург і Маскву. Напрыклад, 20–24 снежня 1911 г. навучэнцы Віцебскай духоўнай семінарыі наведалі г. Санкт-Пецярбург. У Галернай гавані па хадайніцтве протапрэсвітара Ваеннага і Марскога духавенства ім было выдзелена бясплатнае памяшканне. Акрамя манастыра Іаана Кранштадскага, Троіцкага, Пятра-Паўлаўскага, Ісаакіеўскага і іншых сабораў, экскурсанты наведалі Міхайлаўскі палац, Зімовы палац, Марскі музей, Заалагічны музей, оперу [8, арк. 3–4 адв.]. Павелічэнне колькасці экскурсантаў выклікала некаторыя складанасці для прымаючага боку. Кіраўніцтва Свята-Троіцкай Сергіеўскай лаўры прасіла папячыцеля Віленскай навучальнай акругі інфармаваць аб прыбыцці экскурсій не менш як за тры дні «для нармальнага забеспячэння жыллём і харчаваннем» і паведамляла, што ў дні дванадзясятых свят «экскурсіі прымацца не будуць» [9, арк. 3].

Адным з найбольш папулярных аб'ектаў рэлігійнага турызму з'яўляўся Кіеў, які лічыўся праваслаўнай духоўнай сталіцай Расійскай імперыі. У сувязі з гэтым пры Кіеўскай навучальнай акрузе для аказання неабходнай дапамогі экскурсантам была створана камісія па прыёме экскурсій. Папячыцель Віленскай навучальнай акругі рэкамендаваў кіраўнікам навучальных устаноў звяртацца за даведкамі аб арганізацыі экскурсій у Кіеве непасрэдна да камісіі. Да таго ж, у адрозненне ад беларускіх гарадоў, тут дзейнічалі грамадскія турыстычныя арганізацыі, экскурсійныя бюро і цэнтры пры вышэйшых навучальных установах.

якія таксама ўдзельнічалі ў прыёме беларускіх экскурсантаў-навучэнцаў. Апошнія ў большасці спыняліся ў памяшканнях навучальных установ бясплатна або за сімвалічную плату. [10, арк. 77]. Нярэдка экскурсантаў прымалі ў мясцовых манастырах. Так, папячыцель Віленскай навучальнай акругі дазволіў з 14 па 23 чэрвеня 1912 г. правесці экскурсію ў Кіеў і Пачаеў для 15 вучаніц Магілёўскай прыватнай гімназіі В. Н. Касовіч. Мэта – наведванне Кіева-Пячорскай лаўры і Пачаеўскай лаўры для пакланення святыням, а таксама знаёмства з мясцовымі славутасцямі. Паказальным з'яўляецца спіс экскурсантак: у ім усе вучаніцы пазначаны як рускія і праваслаўныя. У Кіеве ім прадставілі памяшканне пры манастыры. Гімназісткі прысутнічалі на царкоўных службах. «агледзелі бліжнія і дальнія пячоры, прыкладаліся да мошчаў святых. наведалі келлю схімніка і выслухалі ад яго настаўленні аб адносінах да бацькоў і карысці навучання» [11, арк. 36]. Падчас экскурсій па Кіеве наведалі некаторыя храмы, азнаёміліся з помнікамі Аляксандру II, Багдану Хмяльніцкаму, княгіні Вользе і інш., пабывалі на канцэрце аркестра ў Купецкім садзе, шмат гулялі па цэнтральных вуліцах горада [11. арк. 37–38].

Трэба адзначыць, што падобныя экскурсіі ажыццяўлялі навучэнцы і іншых рэгіёнаў Расійскай імперыі. Напрыклад, экскурсіі, якія арганізоўвала ў Кіеў Яраслаўская камісія па арганізацыі вучэбна-выхаваўчых экскурсій, праходзілі праз Гомель [12, с. 208].

Аднак не варта пераацэньваць колькасць экскурсій-паломніцтваў у навучальных установах Віленскай навучальнай акругі ў пачатку XX ст. Далёка не ўсе навучэнцы, асабліва ў сельскай мясцовасці, маглі матэрыяльна дазволіць сабе наведванне нават бліжэйшых рэлігійных і гісторыка-культурных аб'ектаў. Да таго ж экскурсіі з'яўляліся новай формай вучэбнай і выхаваўчай дзейнасці і патрабавалі пэўнай падрыхтоўкі і вопыту. Пры адсутнасці на беларускіх землях спецыяльных турыстычных устаноў усе арганізацыйныя моманты ўскладаліся на плечы педагогаў, многія з якіх былі не ў стане ўключыцца ў згаданы працэс. Прыкладам могуць служыць вынікі праведзенага летам 1911 г. анкетавання сярод слухачоў кароткатэрміновых педагагічных курсаў для маладых настаўнікаў і настаўніц Віцебскай і Магілёўскай губерняў пры Полацкай настаўніцкай семінарыі. Так, сярод сямідзесяці ўдзельнікаў толькі дзевятнаццаць праводзілі экскурсіі і прагулкі з вучнямі, і ўсяго чатыры з іх былі экскурсіі-паломніцтвы [13].

Асаблівасцю беларускіх губерняў з'яўляўся шматканфесійны склад насельніцтва. Так, згодна з перапісам 1897 г., на іх тэрыторыях праваслаўныя і адзінаверцы складалі 60 % ад агульнай колькасці насельніцтва [14, с. 75], католікаў налічвалася 1 947 793 чалавекі [14, с. 92], іўдзеяў – 1 209 815 [14, с. 135], мусульман – 13 877 [14, с. 150], таму аб'ектамі рэлігійнага турызму маглі з'яўляцца культавыя ўстановы і святыя месцы розных канфесій – хрысціянства, іўдаізму, ісламу. Аднак аналіз дакументаў паказвае, што падтрымку на адміністрацыйным узроўні атрымліваў толькі праваслаўны рэлігійны турызм, што з'яўлялася часткай дзяржаўнай палітыкі ў галіне адукацыі. Нават у выніку змяненняў у грамадска-палітычным жыцці пасля рэвалюцыі 1907–1905 гг. «…стрыжань канфесійных імкненняў урада – умацаванне кіруючай ролі праваслаўнай царквы ў адукацыі захаваўся, нягледзячы ні на ўказ аб верацярнімасці, ні на маніфест 17 кастрычніка, ні на шэраг наступных заканадаўчых актаў і цыркуляраў па Віленскай навучальнай акрузе» [14, с. 211]. Аўтарам не выяўлены факты арганізацыі экскурсій навучэнцаў у канцы XIX – пачатку XX ст. на рэлігійныя аб'екты іншых канфесій, акрамя праваслаўнай. Напрыклад, экскурсіі, якія праводзіліся яўрэйскімі навучальнымі ўстановамі, наогул не ўключалі наведванне рэлігійных аб'ектаў, а былі засяроджаны на славутых мясцінах рускай гісторыі. Паказальным з'яўляецца зварот кіраўніка Ковенскага пачатковага яўрэйскага вучылішча Рудмана да навучэнцаў у канцы адной з экскурсій. Ён спадзяецца, што ўдзел у ёй дапаможа вучням «свята ахоўваць заветы, якім навучаюцца ў школе: любоў да Айчыны – Расіі, адданасць Прастолу і Цару» [3, с. 173].

Такім чынам, рэлігійныя паездкі і экскурсіі выхаванцаў навучальных устаноў Віленскай навучальнай акругі ў пачатку XX ст. паступова станавіліся часткай адукацыйна-выхаваўчага працэсу. Яны адрозніваліся ад звычайных адукацыйных экскурсій, бо ў першую чаргу былі скіраваны на выхаванне ў навучэнцаў строга рэлігійных паняццяў, шчырай адданасці праваслаўнай царкве і дзяржаўнай уладзе. Дадзеныя мерапрыемствы спрыялі абуджэнню ў навучэнцаў інтарэсу да гістарычнага мінулага краю, разуменню неабходнасці захавання гісторыка-культурнай спадчыны, пашырэнню іх кругагляду і фарміраванню духоўных каштоўнасцей.

Проектъ 84
экскурсіи учениковъ Глусскаго городского училища
въ г. Кіевъ Мѣсяцъ іюнь 1911 года.

Участвуютъ 15 учениковъ и 4 руководителя
въ томъ числѣ уч.-инспекторъ. Отъѣздъ изъ Глуска
въ день акта по окончаніи годовыхъ учебныхъ за-
нятій на трехъ извощикахъ-балагулахъ въ г.
Бобруйскъ; 50 верстъ. Остановка въ Бобруйскомъ
городскомъ училищѣ на 5 часовъ для осмотра
своего уѣзднаго города и бывшей крѣпости. Изъ
Бобруйска отъѣздъ по желѣзной дорогѣ до Гоме-
ля. Изъ Гомеля пароходомъ въ Кіевъ; прибытіе
часовъ въ 7 утра. Остановка въ Кіевскомъ
Михайловскомъ монастырѣ безплатно; гдѣ
можно и получить безплатно и кипятокъ.
Въ Кіевѣ 1-й день посѣщеніе главной церкви
Михайловскаго Монастыря, гдѣ покоятся мощи
Великомуч. Варвары; осмотръ монастыря и
другихъ церквей. Посѣщеніе церкви Андрея
Первозваннаго и церкви Десятинной во имя
Рождества Богородицы. Осмотръ Софійскаго со-
бора и по пути Софійской площади и па-
мятника Богдану Хмельницкому. Обѣдъ въ
столовой Михайловскаго монастыря. Послѣ
обѣда осмотръ картины-панорамы подъ названіемъ
Голгофа, находящейся возлѣ монастыря въ саду
и памятника св. князю Владиміру, величествен-
наго при вечернемъ освѣщеніи электричествомъ.
2-й день — Сельскохозяйственный отдѣлъ при Поли-
техническомъ институтѣ. Обѣдъ въ столовой
института. На обратномъ пути осмотръ
Владимірскаго собора.



3-й день. Обозрение Музея истории и искусства на Александровской улице, ботанический сад института практической школы пчеловодства; и зоологический сад. Обед в Михайлов. мон.
4-й день. Крещатик, как главная улица и посещение Киево-Печерской лавры и поклонение св. мощам угодников. Обед в Лаврской [illegible]. На обратном пути осмотр старой Киевской крепости, [illegible] поля и Ботанического сада. Посещение Николаевского военного собора и Аскольдовой могилы.
5-й день. Осмотр городского сада, Царского дворца и дворцового сада — посещение Братского монастыря и осмотр здания Духовной Академии и Университета с его научными учреждениями. Вечером отъезд из Киева по железной дороге до Бобруйска. Из Бобруйска ученики-богомольцы едут в Глуск. Вся экскурсия займет, считая и поездки, 8 суток.
Стоимость поездки на одно лицо исчисляется в следующем виде:
3 извозчика для учеников из Глуска в Бобруйск и обратно — 15 руб. на одно лицо 1 руб.
Бобруйск – Гомель по льготному тарифу 55 коп.
Гомель – Киев пароходом и ездой 50 коп.
Киев 5 обедов 1.25
Булки для 6 завтраков и 6 ужинов — 60 коп.
Чай, сахар, берут свои из дому —
Непредвиденные расходы 50 коп.
Льготный проезд Киев – Бобруйск = 1 р. 46 к.
Итого 5 руб. 86 к.
Руководитель экскурсии учитель-инспектор

*Малюнак 2.* **Праект экскурсіі Глускага чатырохкласнага гарадскога вучылішча ў Кіеў. 1911 г.**
*Крыніца:* **НГАБ. – Ф. 458. Воп. 1. Спр. 612. Арк. 84–84 адв.**

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Методические рекомендации по разработке и проведению экскурсий по религиозным объектам / А. О. Горанский [и др.]. – Минск: Колорград, 2023. – 375 с.

2. *Дулов, А. Н.* История путешествий и туризма / А. Н. Дулов. К. А. Дюхова, Д. В. Юрчак. – Витебск: Витеб. гос. ун-т, 2011. – 139 с.

3. Описание экскурсий учащихся Виленского учебного округа за 1910 г.: по поручению упр. Вилен. учеб. округа / сост. А. И. Шестов. – Вильня: Изд. упр. Вилен. учеб. округа, 1911. – IX, 238 с.

4. *Ильин, А. Л.* Организация и проведение экскурсий в учебных заведениях дореволюционного Пинска / А. Л. Ильин // Туризм и гостеприимство. – 2014. – № 1. – С. 47–52.

5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 3260. Воп. 1. Спр. 82.

6. *Товаров, С.* Экскурсия-поломничество в Яблочинский монастырь / С. Товаров // Народное образование. – 1910. – № 4. – С. 29–38.

7. НГАБ. – Ф. 2612. Воп. 1. Спр. 160.

8. НГАБ. – Ф. 2597. Воп. 1. Спр. 144.

9. НГАБ. – Ф. 2566. Воп. 1. Спр. 959.

10. НГАБ. – Ф. 2596. Воп. 1. Спр. 67.

11. НГАБ. – Ф. 2265. Воп. 1. Спр. 16.

12. *Ященко, О. Г.* Ученические экскурсии гомельчан накануне Первой мировой войны / О. Г. Ященко // Изв. Гомел. ун-та. – 2010. – № 6. – С. 205–212.

13. НГАБ. – Ф. 2566. Воп. 1. Спр. 655.

14. Канфесіі на Беларусі (канец XVIII – XX ст.) / В. В. Грыгор’ева [і інш.]; пад рэд. У. І. Навіцкага. – Мінск: Экаперспектыва, 1998. – 340 с.

15. *Снапковская, С. В.* Конфессионализация культурно-образовательных процессов на территории Беларуси во второй половине XIX – начале XX в. / С. В. Снапковская. – URL: https://elib.bsu.by/handle/123456789/95193 (дата обращения: 11.03.2025).